**Р. Р. Лазько**
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ВОБРАЗЫ ЧУЖОГА ЯК ФАКТАР І МЕЖЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВАТВОРЧАСЦІ НА ЯЕ ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ (1917–1920 ГГ.)

Цэнтрабежныя тэндэнцыі ў развіцці Расійскай імперыі, паскораныя катастрафічным для яе ходам Першай сусветнай вайны, праз тры гады пасля яе пачатку набылі маштабы бегства нацыянальных ускраін ад імперскага цэнтра. Гэты працэс ахапіў і Паўночна-Заходні край імперыі, які тады ўсё часцей называлі Беларуссю (ці Белоруссией у варыянце, больш прывычным рускаму па паходжанні і па культуры мясцоваму чыноўніку). Больш таго, калі абмежаваць погляд на праблему паласой тэрыторыі ад Прыбалтыкі да Украіны, на якой імперыя да вайны аддзялялася і адначасова сутыкалася з Еўропай, то давядзецца прызнаць, што Беларусь дзякуючы свайму геапалітычнаму становішчу, шматканфесійнаму характару насельніцтва і адсутнасці натуральных межаў апынулася ў цэнтры названага працэсу ў рэгіёне, хутка прывёўшага да пачатку фарміравання тут нацыянальных дзяржаў. Карыстаючыся названымі акалічнасцямі, нацыянальныя лідары ўсіх народаў-суседзяў і створаныя імі арганізацыі ўключалі ў свае дзяржаватворчыя праекты тую ці іншую частку этнічнай тэрыторыі Беларусі і мабілізавалі для падтрымкі гэтых праектаў усе наяўныя рэсурсы разам з этнічнымі вобразамі і фобіямі. У справе выкарыстання этнічных вобразаў для сваіх мэтаў не стаў выключэннем і беларускі нацыянальны рух. Этнічныя вобразы як аб'ектыўна, так і суб'ектыўна, у выглядзе інструментаў для мабілізацыі падтрымкі палітычных праектаў і праграм, паслужылі адным з важных фактараў і беларускага дзяржаватварэння. Гаворка ідзе, перш за ўсё, аб беларускіх вобразах вялікіх суседзяў беларусаў – Расіі і рускіх, з аднаго боку, Польшчы і палякаў – з другога. Заўважым, што на першым Усебеларускім кангрэсе ў снежні 1917 г. у групе найбольш балючых і неадкладных праблем, якія дэлегіраваліся для рашэння будучай беларускай дзяржаве, спрэчак не выклікалі толькі тры: бязладдзе (хаос), якое чыніла расійскае войска, распадаючыся на тэрыторыі Беларусі, дзеянні польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага, які пераўтвараўся ў абаронцу польскага землеўладання ў месцах сваёй дыслакацыі, і бежанская праблема.

Тая адзінадушна ахапіўшая ўдзельнікаў Усебеларускага кангрэса трывога наконт вынікаў для Беларусі разлажэння расійскага войска (ужо відавочных) і дзеянняў корпуса Доўбар-Мусніцкага будзе цалкам зразумелай, калі ўсвядоміць, што яна жывілася набытым за стагоддзі вопытам суіснавання беларусаў побач з палякамі і рускімі, уключаючы і больш чым стагоддзе іх суседства ў складзе Расійскай імперыі. На аснове гэтага вопыту ў менталітэце беларусаў сфарміраваліся ўстойлівыя вобразы народаў-суседзяў, прычым, вобразы шматгранныя, багатыя і супярэчлівыя, з перавагай у кожным з іх негатыўных, але неаднолькавых элементаў. Вось вобраз расейца – «маскаля», тыповы вобраз чужога: «Тату, тату, лезе чорт у хату! – Нічога, сынку, абы не маскаль», – на такую небяспеку, для беларуса горшую за чорта, указвае адна з прымавак, запісаных на беларуска-рускім памежжы. Другая дае квінтэсенцыю вобраза паляка: «Па чым відаць ляха? – Па тым, што на чэраве бляха» [1]. Паляк, значыць, фанабэрлівы, любіць выдзеліцца і ўспрымае беларуса звысака. Відавочна, што гэтыя кампаненты беларускага вобразу паляка фарміраваліся пад уплывам сацыяльных фактараў: у беларускім фальклоры памешчык, пан – гэта заўсёды паляк.

Адной з істотных праблем беларускага нацыянальнага руху ў той момант, калі ён выйшаў на рубеж стварэння ўласнай дзяржаўнасці (акрамя, зразумела, слабасці яго матэрыяльных і культурных рэсурсаў) была тая акалічнасць, што абедзве асноўныя знешнія для яго пагрозы – расійская і польская – выявіліся амаль адначасова, а на працягу 1919–1920 гг. дзейнічалі зусім сінхронна, нягледзячы на стан вайны паміж іх носьбітамі. Выступленне корпуса Доўбар-Мусніцкага, хоць у значнай ступені і справакаванае



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

палітыкай бальшавіцкіх уладаў, патрабаваўшых яго «дэмакратызацыі», стала прадвесцем, свайго роду мадэллю той верагоднай палітыкі на ўсход ад Буга, якую будзе гатовая праводзіць польская дзяржава – палітыкі абароны дарэвалюцыйнага сацыяльнага статускво. Гэта небяспека стрымлівала працэс дыстанцыравання беларускага руху ад эпіцэнтра «бязладдзя» і дэмаралізацыі, якім была ўпаўзаўшая ў грамадзянскую вайну Расійская дзяржава, і рух у накірунку будаўніцтва «сваёй хаты», беларускай нацыянальнай дзяржавы. Як-ніяк, хоць бальшавікі і былі носьбітамі бязладдзя і самаволі, але і былі праціўнікамі памешчыцкага землеўладання, а значыць аб'ектыўна – саюзнікамі беларускага сялянства ў барацьбе за зямлю. Заўважым, сітуацыя не была унікальнай – падобная склалася і ў Паўночнай Прыбалтыцы, дзе эстонскія і латвійскія сяляне падтрымалі прыход бальшавікоў да ўлады як сваіх саюзнікаў у барацьбе супраць землеўласнікаў-немцаў.

Што да носьбіта другой небяспекі для беларускага нацыянальнага руху – польскай дзяржавы, то яна, адраджаючыся на сваім гістарычным месцы, імкнулася адапхнуць свайго гістарычнага праціўніка – Расію – далей на ўсход, на рускую этнічную тэрыторыю, і ў гэтым сэнсе выступала саюзніцай беларускага руху ў справе будаўніцтва беларускай дзяржавы. Для беларускага нацыянальнага руху склалася неабходнасць рухацца «паміж Сцылай і Харыбдай», шукаючы для сябе апору ў беларускім сялянстве, з аднаго боку, і знешніх саюзнікаў – з другога. Аптымальнага рашэння гэтай праблемы не існавала, кожны варыянт быў звязаны з вялікімі стратамі ў працэсе беларускай дзяржаватворчасці.

Такім чынам, драматычная геапалітычная сітуацыя, у якой развіваўся беларускі нацыянальны рух ужо з канца 1917 г., стала як бы другім узроўнем фарміравання ментальнага тыпу і тыпу паводзін, які стаў пераважаючым для удзельнікаў гэтага руху. А першым фундаментальным узроўнем быў этнапсіхалагічны – этнічныя вобразы і стэрэатыпы, пануючыя ў масавай свядомасці і ў ментальнасці элітных груп, паходзішўых з сялянства. Усвядоміўшы гэту сітуацыю, не даводзіцца сёння здзіўляцца таму, што беларускі нацыянальны рух, спрабаваўшы стварыць нацыянальную дзяржаву ў 1918–1920 гг., быў плюралістычным як у ідэйных адносінах, так і ў сваёй тактыцы, яго суб'екты праяўлялі пастаянныя ваганні, прыстасаванства, імкнучыся, тым не менш, не страціць арыенціраў барацьбы. Але гэта не ўсім удавалася. У палітычным кантэксце польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. пераважаўшы ў беларускім руху тып палітычных паводзін найбольш адэкватна выразіўся ў тактыцы барацьбы на два франты, якую прыняла на ўзбраенне найбольш уплывовая на той час Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Адным з франтоў была памешчыцкая і нацыяналістычная Польшча, другім – бальшавіцкая Расія. Палітычным вынікам гэтай тактыкі было ўратаванне ад сыходу ў нябыт беларускай савецкай рэспублікі на невялікай частцы тэрыторыі Беларусі. Па іроніі гісторыі, кіравалі ёю расійскія бальшавікі – прынцыповыя праціўнікі беларускай нацыянальнай дзяржавы, – але кіравалі ёю праз сваіх мясцовых выхаванцаў [гл. 2]. Другая ж частка Беларусі наогул была перададзена Польшчы як цана Савецкай Расіі за мір з ёю.

Заўважым, што на працягу ўсяго выдзеленага намі часу ішоў інтэнсіўны працэс асваення нацыянальнай ідэі беларускім сялянствам – зразумела, у даступнай для яго форме: як патрабаванне спыніць бязладдзе, якое ўчынялі «чужаніцы» на яго зямлі, у закліках «будаваць сваю хату», ствараць «уладу са сваіх людзей», якая не дапусціць такога бязладдзя. Гэты працэс, разам з геапалітычнай сітуацыяй у заходнім памежжы, былі вымушаны ўлічваць маскоўскія рэжысёры стварэння беларускай савецкай рэспублікі як пры першым яе «выданні», так і ў час рыжскіх мірных перагавораў 1920 г.

Прадстаўленая намі схема ўзаемадзеяння ментальных этнапсіхалагічных і палітычных фактараў беларускага нацыянальнага руху ў 1917–1920 гг., натуральна, патрабуе далейшага «ажыўлення» шляхам падвядзення пад яе больш грунтоўнага фундамента канкрэтна-фактагалагічных даследаванняў. Гаворка ідзе, перш за ўсё, аб даследаванні масавых рухаў у азначаны перыяд, суадносін (а па сутнасці – перапляцення) у гэтых рухах сацыяльных і нацыянальных фактараў, а таксама вывучэння адносін паміж народам і ўладай на кожным павароце таго зменлівага часу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс выкарыстаных крыніц

1 Церашковіч, П. «Чужыя» і «свае» ў этнічных стэрэатыпах / П. Церашковіч // Наша ніва. – 1993. – № 11. – С. 8.

2 Лазько, Р. Пачатак трагедыі. Аб «беларускіх таварышах», з якімі згадзіўся ЦК РКП(б) 24 снежня 1918 г. / Р. Лазько // Запісы. Інстытут імя братоў Луцкевічаў. – Год 1. – Сшытак 1. – Менск, 2020. – С. 5–35.